Итог периода – формирование профессионального ОВИИ в Беларуси через синтез русской и западноевропейской вокально-исполнительской стилистики и традиций на белорусской почве.

Таким образом, условия исторического формирования ОВИИ в Беларуси повлекли его тесную связь с русским и западноевропейским оперным исполнительством, ставшими определяющими в процессе его исторически подвижного формирования со свойственными логикой, динамикой, качественными показателями.

УДК 069.12(476.1)

**К. А. Скур'ят,**
*саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

## МУЗЕЙНА-ПЕДАГАГІЧНЫ ЗАНЯТАК ЯК ФОРМА РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ЭТНАГРАФІЧНАЙ СПАДЧЫНЫ МУЗЕЯМІ НА ТЭРЫТОРЫІ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Анатацыя.** Музеі з'яўляюцца цэнтрамі прэзентацыі беларускай гісторыі і культуры. Музеі Мінскай вобласці валодаюць унікальнымі этнаграфічнымі калекцыямі, якія дазваляюць комплексна ўявіць побыт і культуру беларускага этнасу. Адной з найбольш папулярных форм рэпрэзентацыі традыцыйнай культуры Беларусі сталі музейна-педагагічныя заняткі. У артыкуле разглядаюцца спосабы і формы правядзення такіх заняткаў у музеях на тэрыторыі Мінскай вобласці, іх роля ў захаванні і папулярызацыі этнаграфічнай спадчыны краю.

**Ключавыя словы:** музей, этнаграфія, рэпрэзентацыя, музейна-педагагічны занятак, Мінская вобласць, традыцыйная культура.

**K. Skuryat,**
*Competitor of a scientific degree of Candidate of Sciences degree of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## MUSEUM AND PEDAGOGICAL ACTIVITY AS A FORM OF REPRESENTATION OF ETHNOGRAPHIC HERITAGE BY MUSEUMS IN THE TERRITORY OF MINSK REGION

**Abstract.** Museums today are the centers of representation of Belarusian history and culture. Museums of the Minsk region have unique ethnographic collections that allow for a comprehensive presentation of the life and culture of the Belarusian ethnic group. One of the most popular forms of representation of the traditional culture of Belarus are museum-pedagogical classes. The article examines the methods and forms of conducting museum-pedagogical classes in museums in the Minsk region, their role in preserving and popularizing the ethnographic heritage of the region.

**Keywords:** museum, ethnography, repprresentation, museum-pedagogical activities, Minsk region, traditional culture.

Сёння ва ўмовах глабалізацыі культуры становяцца ўсё больш актуальнымі тэндэнцыі самаідэнтыфікацыі розных народаў і культур, расце інтарэс да традыцыйнай культуры. Значная маса этнаграфічнай спадчыны беларусаў захоўваецца ў дзяржаўных музеях Рэспублікі Беларусь. Так, на тэрыторыі Мінскай вобласці дзейнічаюць 24 музеі. Амаль у кожным з іх захоўваюцца этнаграфічныя калекцыі. Найбольш эфектыўна працэс актуалізацыі этнаграфічнай спадчыны ажыццяўляецца праз культурна-адукацыйную дзейнасць музея. Адной з найбольш папулярных форм рэпрэзентацыі традыцыйнай культуры Беларусі з'яўляюцца музейна-педагагічныя заняткі. Па словах экс-прэзідэнта Міжнароднага камітэта ІКОМ па адукацыі і культуры К. Брунінгсхаус-Кнубель, ідэальны музейны педагог павінен «ведаць калекцыю музея, быць здольным данесці свае веды да слухачоў і валодаць асабістым абаяннем» [2, с. 14].

Большая частка музейна-педагагічных заняткаў мае ігравы інтэрактыўна-комплексны характар і праводзіцца па папярэдняй дамоўленасці. Прыкладам служыць цыкл заняткаў, прысвечаны традыцыйнай беларускай кухні, які праводзіцца на базе гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе».

Кожны з заняткаў прысвячаецца пэўнаму віду традыцыйных страў (малочныя, мучныя і г. д.). Пачынаецца занятак з тэарэтычнай часткі, удзельнікам распавядаюць пра значэнне страў, працэс падрыхтоўкі і г. д., прысутнічаюць элементы інтэрактыву – удзельнікам паказваюць розныя віды традыцыйнага посуду з фондаў музея, даюць зрабіць прасцейшыя аперацыі, як прасейванне мукі праз сіта. Потым пачынаецца ігравая частка – удзельнікі выконваюць разнастайныя заданні, адпавядаючыя зададзенай тэматыцы – разлажыць у адпаведным парадку працэс прыгатавання ежы, згуляць у народную гульню (напрыклад «Каравай») і г. д.

Нярэдка музейна-педагагічныя заняткі прымяркоўваюць да народных свят. Так, супрацоўнікамі Мінскага абласнога краязнаўчага музея на Масленічны тыдзень для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту праводзіцца ігравы ўрок «Масленіца» [4].

Кожны з 7 этапаў занятку сімвалізуе адзін дзень масленічнага тыдня [7]. Кожны этап складаецца з трох частак. У першай частцы ўдзельнікам распавядаюць аб пэўным этапе святкавання Масленіцы, на другім этапе – гуляюць у традыцыйную масленічную гульню (напрыклад «Бразготкі»), на трэцім – спяваюць традыцыйную масленічную песню і атрымліваюць картку з назвай інгрэдыентаў для падрыхтоўкі сакрэтнай масленічнай стравы (бліноў з грэцкай мукі). Напрыканцы занятку ўдзельнікі адгадваюць назву «сакрэтнай» стравы

і атрымоўваюць яе ў якасці ўзнагароды. Паяданне бліноў з'яўляецца даўняй і вядомай масленічнай традыцыяй [5].

Практычныя заняткі ў музеі, як правіла, праходзяць у форме групавых і індывідуальных майстар-класаў. Разнастайныя практычныя заняткі праводзяцца навуковымі супрацоўнікамі Івянецкага музея традыцыйнай культуры [6]. Івянец сёння з'яўляецца адным з ганчарных цэнтраў Рэспублікі Беларусь, ужо ў канцы XIX ст. у мястэчку дзейнічалі 17 майстэрняў [3], а першыя пісьмовыя звесткі пра івянецкіх ганчароў адносяцца да XVI ст. [8].

Індывідуальныя майстар-класы па ганчарным рамястве праводзяцца ў Доме рамёстваў, які ўваходзіць у склад экспазіцыі музея. Склад удзельнікаў вар'іруецца ад 1 да 3 чалавек, звычайна гэта сямейныя пары. Час правядзення складае 1–2 гадзіны. Спачатку майстар распавядае пра спосабы апрацоўкі гліны, прафесію ганчара, прыёмы працы і г. д. Пасля дэманстрацыі ўдзельнік з дапамогай майстра спрабуе стварыць элемент дэкору або посуд на ганчарным коле.

Прыкладам групавога майстар-класа служыць праграма «Лепім самі» Івянецкага музея традыцыйнай культуры. Тэматыка заняткаў разнастайная (зааморфная пластыка, посуд і г. д.). Аб правядзенні занятку паведамляецца за 3–4 дні да яго пачатку ў сацыяльных сетках музея, прыходзіць могуць усе жадаючыя. Як правіла, гэта школьнікі малодшых і сярэдніх класаў у колькасці да 15 чалавек. Сярэдняя працягласць – 50 хвілін. Спачатку ўдзельнікам праводзяць невялікую экскурсію з дэманстрацыяй прадметаў зададзенай тэматыкі з калекцыі музея. Потым яны лепяць пэўную фігурку, пасля сушкі супрацоўнік музея абпальвае фігуркі. Некаторыя цацкі, выробленыя школьнікамі, прадстаўлены ў музейнай экспазіцыі.

Акрамя майстар-класаў практыка можа выкарыстоўвацца як інтэрактыўны элемент для лепшага замацавання матэрыялу. Пад наглядам навуковага супрацоўніка ўдзельніку даюць магчымасць пазаймацца адным з відаў традыцыйнага рамяства.

Так, у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў в. Строчыца Мінскага раёна праводзіцца музейна-педагагічны занятак «Беларускі лён» [1]. Музей з'яўляецца першым на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь скансэнам (музеем пад адкрытым небам), у якім прадстаўлены аўтэнтычныя будынкі народнай архітэктуры з розных рэгіёнаў Беларусі.

Занятак складаецца з экскурсіі па экспазіцыі «Беларускі лён», якая змешчана на тэрыторыі помніка архітэктуры канца XIX – пач. XX ст. «Сядзіба з в. Заброддзе Стаўбцоўскага раёна» [1]. Для замацавання матэрыялу наведвальніку даюць магчымасць прыняць удзел у простых працэсах апрацоўкі льну, напрыклад трапанні або расчэсванні валакна і інш.

Выязныя заняткі звычайна арганізоўваюцца на базах школ горада і раёна, у якім размешчаны музей. Нярэдка яны ўяўляюць выязныя варыянты праходзячых на базе музея заняткаў і суправаджаюцца прыездам супрацоўнікаў музея з наборам музейных прадметаў. Яскравым прыкладам такога варыянта служыць цыкл «Таямніцы Беларускай хаты», распрацаваны супрацоўнікамі Мінскага абласнога краязнаўчага музея [4]. Перад выездам з кіраўніцтвам школы абмяркоўваецца тэма, якой надаецца больш увагі. Занятак праводзіцца з элементамі тэатралізаванай экскурсіі: удзельнікаў запрашаюць у імправізаваны сялянскі дом і распавядаюць аб інтэр'еры традыцыйнага жылля, прадметах побыту і даюць магчымасць пакарыстацца імі.

Усё часцей на дапамогу музейным супрацоўнікам прыходзяць мультымедыйныя сродкі, асабліва пры немагчымасці і складанасці вывазу прадметаў з калекцый музея. Так, падчас выязнога занятку «Традыцыйныя беларускія касцюмы», распрацаванага навуковымі супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, для вучняў 7–11 класаў з дапамогай мультымедыйных сродкаў дэманструюцца фотаздымкі традыцыйных строяў з фондаў музея. Напрыканцы ўдзельнікі танцуюць народныя танцы («Лявоніха», «Картузы»), гуляюць у традыцыйныя беларускія гульні («Явар», «Журавель», «Цяцера»).

Такім чынам, музеямі на тэрыторыі Мінскай вобласці праводзіцца шэраг музейна-педагагічных заняткаў, якія абапіраюцца на традыцыйную культуру беларускага народа. Большая частка такіх заняткаў мае ігравы інтэрактыўна-комплексны характар і праводзіцца па папярэдняй дамоўленасці. Асноўнай катэгорыяй удзельнікаў з'яўляюцца навучэнцы пачатковай і сярэдняй школы. У занятках актыўна выкарыстоўваюцца ігравыя і анімацыйныя элементы. Папулярнасцю карыстаюцца музейныя ўрокі з уключэннем ігравых элементаў, практычныя майстар-класы па традыцыйных народных рамёствах, выязныя заняткі, заняткі з выкарыстаннем мультымедыйных сродкаў. Такая дзейнасць спрыяе абуджэнню цікавасці да спадчыны беларусаў, выхаванню пачуцця гонару і сувязі пакаленняў.

*1.* Белорусский государственный музей народной архитектуры и быта. Музейно-педагогические занятия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ru.etna.by/services/muzejnye zanyatiya. – Дата доступа: 15.08.2024.

2. *Брюнингсхаус-Кнубель, К.* Музейный педагог – защитник интересов посетителей / К. Брюнингсхаус-Кнубель // Museum. – 2009. – № 2. – С. 14.

3. Волости и важнейшие селения Европейской России: по данным обследования, произведенного стат. учреждениями Мин-ва вн. дел. Вып. 5. Губернии Литовской и Белорусской областей / Центр. стат. комитет. – СПб., 1886. – С. 98.

*4.* ГУ «Минский областной краеведческий музей». Музейные занятия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://molodechno-mokm.museum.by/node/57845. – Дата доступа: 10.08.2024.

5. *Гурко, А. В.* Этнические традиции национальной кухни Беларуси / А. В. Гурко, Л. В. Бохан, Н. С. Бункевич. – Минск, 2019. – С. 60.
6. Ивенецкий музей традиционной культуры [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://museums.by/muzei/muzei g minska i minskoy oblasti/ ivenetskiy muzey-traditsionnoy-kultury/. – Дата доступа: 19.08.2024.
7. *Катовіч, А.* Веснавыя святы: нарысы : у 2 кн. // А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск, 2005. – Кн. 1. – С. 74.
8. *Сахута, Я. М.* Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск,1997. – С. 107.

УДК 242-534.5+24-583

**Н. В. Славинская,**
*аспирант кафедры культурологии учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск, Беларусь*

## МАНТРА В СОЦИОКУЛЬТУРНОМ КОНТЕКСТЕ (НА ПРИМЕРЕ НОВЫХ РЕЛИГИОЗНЫХ ДВИЖЕНИЙ)

**Аннотация.** Рассматриваются особенности таких понятий, как «мантра» и «мантра-медитация», смыслы и значения основных мантр в традиции вайшнавизма и тибетского буддизма. Выявлено их общее содержание и некоторые различия.

Автор приходит к выводу, что с развитием сетевого общества мантры приобрели популярность во многих культурах и жанрах, а современные люди все чаще обращаются к практике медитации с использованием мантр.

**Ключевые слова:** мантра, мантра-медитация, культура.

**N. Slavinskaya,**
*Postgraduate student of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## MANTRA IN A SOCIAL AND CULTURAL CONTEXT (on the example of new religious movements)

**Abstract.** The article examines the features of such concepts as mantra and mantra meditation, the meanings and significance of the main mantras in the tradition of Vaishnavism and Tibetan Buddhism and reveals their common content and some differences.

The author comes to the conclusion that with the development of the network society, mantras have become popular in many cultures and genres, and modern people are increasingly turning to the practice of meditation using mantras.

**Keywords:** mantra, mantra meditation, culture.

Исследование специфики мантры (мантр) и проявления мантра-медитации в культурном пространстве является актуальной темой